тэарэтычнага матэрыялу, уменне знайсці патрэбнае рашэнне. Работа з пытаннямі для самакантролю павышае цікавасць да курса, садзейнічае развіццю такіх здольнасцей студэнта, як уменне самастойна арыентавацца ў тэарэтычным матэрыяле, аналізаваць, абагульняць інфармацыю, вылзяляць галоўнае, канкрэтызаваць яго, многааспектна падыходзіць да паняццяў і з'яў.

Выкананне лабараторных работ у найбольшай ступені садзейнічае фарміраванню прафесійных навыкаў і уменняў будучых спецыялістаў. І тут трэба гаварыць як аб праблематыцы гэтых работ, так і аб форме іх правядзення. Тэматыка лабараторных работ па курсу «Інфарматыка» адлюстроўвае сучасны ўзровень практычнай дзейнасці бібліятэк і інфармацыйных устаноў. Усе яны звязаны з засваеннем нетрадыцыйных метадаў выканання інфармацыйных працэсаў, асваеннем тэхналагічных аперацый перадмашыннай, машыннай і паслямашыннай апрацоўкі інфармацыі. З'явіліся новыя тэмы, напрыклад «Вызначэнне інфарматыўнасці дакументаў», «Стварэнне і выкарыстанне аўтаматызаванай фактаграфічнай інфармацыйна-пошукавай сістэмы», «АРМ карыстальніка». Пры выкананні сямі - дзесяці лабараторных работ па курсу «Інфарматыка» выкарыстоўваецца ПЭВМ. Гэта выпрацоўвае пэўны стыль мыслення ў студэнтаў, павышае навуковую арганізацыю працы, развівае навыкі працы на камп'ютэры, стварае прынцыпова новыя ўмовы для набыцця ведаў. Любыя лабараторныя заняткі патрабуюць індывідуальнага падыходу да навучання, асабліва тыя, якія звязаны з працай на ПЭВМ.

У камп'ютэрных класах трэба праводзіць толькі дробнагрупавыя заняткі, а па некаторых тэмах нават індывідуальныя. Гэта будзе ў значнай меры павышаць якасць навучання і ў выніку садзейнічаць развіццю здольнасцей студэнтаў.

Трэба закрануць і такія пытанні, як неабходнасць павышэння ўзроўню ПЭВМ, стварэнне універсітэцкай бібліятэчна-інфармацыйнай лакальнай сеткі з далейшым яе выхадам на знешнія сеткі. Гэта дазволіць развіваць не толькі практычныя навыкі выкарыстання сучасных тэхналогій, але і ў цэлым павысіць якасць падрыхтоўкі студэнтаў для будучай работы ў рэжыме сеткавай тэхналогіі.

Навукова-даследчы напрамак развіцця здольнасцей студэнтаў звязаны з выкананнем курсавых і дыпломных работ, якія фарміруюць здольнасці самастойна мысліць, арыентавацца ў вычэбным матэрыяле, дакладна, лагічна прадстаўляць яго, творча падыходзіць да вывучаемай праблемы, бачыць асноўныя напрамкі яе далейшага даследавання.

Такім чынам, спалучэнне некалькіх напрамкаў па развіццю здольнасцей студэнтаў у працэсе выкладання курса дазволіць будучаму спецыялісту актыўна, плённа і творча вырашаць прафесійныя задачы.

**Ляйко Н.А.,**
дацэнт

## УДАСКАНАЛЕННЕ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ ПА РАЗВІЦЦЮ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ СТУДЭНТАЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ КУРСА ПА ВЫБАРУ «РАБОТА БІБЛІЯТЭК ПА АДРАДЖЭННЮ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ»

Удасканаленню падрыхтоўкі кадраў і развіццю творчых здольнасцей студэнтаў у значнай ступені садзейнічаюць курсы па выбару. Калі студэнт робіць свой выбар курса, гэтым ён адказвае на пытанне, што больш за ўсё яго цікавіць, дзе ў сваёй будучай дзейнасці ён знойдзе задавальненне.

Выкладанне на працягу пяці гадоў курса па выбару «Работа бібліятэк, якія абслугоўваюць дзяцей, па адраджэнню нацыянальнай культуры», сведчыць аб наступным: нягледзячы на тое, што толькі 1/3 студэнтаў прыйшлі вучыцца па прызванню, а астатнія -- выпадкова, на апошнім курсе ў асноўным студэнты правільна ацэньваюць сваю прафесію. Яны прыйшлі вучыцца на факультэт бібліятэчна-інфармацыйных сістэм.

таму што «любяць кнігу», «бачаць у ёй сябра і дарадчыка», «гадаваліся на кнігах», таму што «кніга дапамагае фарміраванню асобы» і г.д. Усе студэнты правільна вызначаюць галоўныя прафесійныя якасці бібліятэкара. Да іх адносяць «прафесійныя веды і ўменні», «шырокую эрудыцыю», «начытанасць», «веданне літаратуры», «тэхналогію апрацоўкі дакументаў і арганізацыю каталогаў», «аператыўнасць у абслугоўванні чытачоў» і г.д. Будучыя бібліятэкары разумеюць, што для сапраўднага спецыяліста, які працуе з людзьмі, вельмі важнымі з'яўляюцца і асабістыя якасці. Да іх адносяцца: камунікабельнасць, карэктнасць, тактоўнасць, вытрымка, добразычлівасць.

Прафесійныя і асабістыя якасці дапамагаюць адказаць на пытанне: «Што з'яўляецца галоўным -- работа з кнігай або з чытачом?» 2/3 студэнтаў адказалі: «работа з чытачом праз кнігу», «і тое, і другое», «уменне працаваць з чытачом і кнігай». Адказ на гэтае пытанне дапамагае зразумець адказ і на наступнае: «Як вы будзеце адносіцца да чытачоў?». Толькі адзін студэнт кожны год адказвае, што «будзе цярпець чытача», а астатнія студэнты «будуць паважаць чытача».

Вельмі прыемна чытаць адказы на «прэстыжнае і непрэстыжнае ў прафесіі бібліятэкара». «Непрэстыжнае -- малая зарплата». Але, нягледзячы на гэта, студэнты заўважаюць, што «наша прафесія прэстыжная, таму што яна дае магчымасць заўсёды быць сярод кніг і людзей», «выкарыстоўваць масівы інфармацыі і свой творчы патэнцыял у рабоце з чытачамі». Больш за ўсё студэнтам у будучай прафесіі падабаецца працаваць з людзьмі, асабліва з дзяцьмі, падабаецца работа з кнігай і чытачом. Анкета сведчыць таксама аб тым, што, нягледзячы на малую зарплату, студэнты хочуць працаваць у бібліятэках (за выключэннем 1-2 студэнтаў). Прычым жадаюць працаваць менавіта ў дзіцячых і школьных бібліятэках. На жаль, на пытанне: «Якую ролю ў выбары прафесіі адыграла бібліятэка?» -- адказ недакладны, не заўсёды станоўчы. Затое большасць студэнтаў факультэта завочнага навучання адказалі: «Бібліятэка дапамагла выбраць прафесію».

На апошняе пытанне анкеты: «Што можна і што патрэбна змяніць пры выкладанні спецыяльных дысцыплін для лепшага авалодання прафесіяй бібліятэкара?» -- студэнты адказалі, што, у асноўным, яны задаволены тым, як праходзяць заняткі. Разам з тым каля 80% студэнтаў прапаноўваюць павялічыць колькасць лабараторных заняткаў і абавязкова значную частку з іх праводзіць у бібліятэках. Студэнты прапаноўваюць уключыць у вучэбны план курсы мастацкага чытання і аратарскага майстэрства.

На наш погляд, развіццю творчых здольнасцей студэнтаў садзейнічаюць семінарскія заняткі па тэме «Стан і перспектывы развіцця бібліятэк, якія абслугоўваюць дзяцей», што праходзяць у форме дыскусіі або круглага стала, і навукова-практычныя канферэнцыі на тэмах «Прафесія бібліятэкара вачыма выпускніка», «Рабочае месца, якім я яго ўяўляю», «Работа бібліятэк па адраджэнню нацыянальнай культуры» і інш.

Нам бачыцца, што развіццю творчых здольнасцей студэнтаў будзе садзейнічаць: 1) павелічэнне колькасці гадзін на курсы па выбару; 2) чытанне курса «Работа бібліятэк па адраджэнню нацыянальнай культуры» для студэнтаў усіх спецыялізацый; 3) павелічэнне колькасці заняткаў, якія праводзяцца на базе бібліятэк; 4) уключэнне ў вучэбны план курсаў «Мастацкае чытанне» і «Аратарскае майстэрства»; 5) штогадовая правядзенне з усімі выпускнікамі ФБІС і ФЗН навукова-практычнай канферэнцыі па тэме «Бібліятэкар -- прафесія творчая».

Падсумаванне вынікаў сведчыць аб тым, што заняткі са студэнтамі трэба праводзіць так, каб у час вучобы ва універсітэце студэнты кожны дзень атрымлівалі станоўчую інфармацыю аб сваёй прафесіі з дапамогаю як навуковых лекцый, дыскусійных семінараў, так і творчых лабараторных заняткаў на базе бібліятэк і з выкарыстаннем сучасных тэхналогій (маецца на ўвазе праца з камп'ютэрамі). Толькі ў гэтым выпадку мы атрымаем спецыялістаў, якія змогуць вытрымаць усе цяжкасці і расчараванні, што



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сустрэнуцца у рабоце, і будуць не толькі добрасумленна адносіцца да сваёй справы, але і атрымліваць ад работы вышэйшае з задавальненняў -- асалоду.

**Дзяменцька Л.А.,**
прафесар

## ФОРМЫ НАВУЧАННЯ СТУДЭНТАЎ І ІХ УПЛЫЎ НА РАЗВІЦЦЁ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ У ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ КУРСА «БІБЛІЯТЭКА І ВОЛЬНЫ ЧАС»

Праблемы вольнага часу насельніцтва цесна звязаны з бібліятэчным абслугоўваннем. Значнасць набываюць формы і метады абслугоўвання, рэжысёрскія і драматургічныя здольнасці бібліятэкараў пры распрацоўцы і арганізацыі бібліятэчных мерапрыемстваў.

У працэсе выкладання курса «Бібліятэка і вольны час» маюць месца розныя формы навучання: тэарэтычныя (лекцыі), практычныя заняткі, камбінаванае навучанне (выкананне рэфератаў на базе пэўных бібліятэк, дыскусіі ў выглядзе круглых сталоў, семінары па абмеркаванню студэнцкіх работ).

Кожнай форме ўласцівы набор характэрных прымет: склад групы (спецыялізацыя, стаж работы для студэнтаў-завочнікаў, адукацыя -сярэдняя, агульная ці сярэдняя спецыяльная), месца правядзення (аўдыторыя, бібліятэка), час правядзення (па раскладу ці з выхадам за яго межы).

Важнае месца ў развіцці творчых здольнасцей студэнтаў займаюць: мэта заняткаў (паведамленне навін у галіне тэорыі і практыкі, накіраванасць на набыццё студэнтамі ўменняў і навыкаў практычнага характару); метады і прыёмы навучання (інфармацыйна-праблемныя паведамленні, тлумачэнне матэрыялу, гутаркі, аналіз меркаванняў студэнтаў падчас дыскусій, праверка практычных заданняў); спосабы кіравання мысліцельнай дзейнасцю студэнтаў (пастаноўка пытанняў, якія аб'ядноўваюць тэарэтычны матэрыял і практычны вопыт, стварэнне праблемных сітуацый, вырашэнне пэўных індывідуальных задач і г.д.); віды вучэбнай дзейнасці (праслухоўванне лекцый, удзел у семінарах, дыскусіях, выкананне пэўнага задання -- удзел у мерапрыемстве, распрацоўка сцэнарыя, напісанне рэферата); спосаб кантролю (ацэнка сцэнарыя, праведзенага мерапрыемства цалкам і індывідуальнага ўдзелу ў ім кожнага студэнта; франтальнае апытанне).

Вар'іраванне гэтых метадычных прыёмаў прыводзіць да якасных змен у формах вучэбных заняткаў.

Адна з асноўных форм навучання -- лекцыя (праблемная, інфармацыйная, дыскусійнага характару, лекцыя-дыялог і г.д.). Удасканаленню яе эфектыўнасці з пункту гледжання развіцця творчых здольнасцей студэнтаў садзейнічае распрацаваная спецыяльна для кожнай студэнцкай групы анкета з уваходным і выхадным кантролем. З мэтай уваходнага кантролю прадугледжаны пытанні: з якімі формамі забеспячэння вольнага часу вы сустракаліся ў бібліятэках? Якія лічыце больш эфектыўнымі? Аб якіх хацелі б даведацца пры вывучэнні курса?

Аналіз адказаў дазваляе выявіць узровень інфармаванасці студэнтаў, іх адносіны да бібліятэчнага абслугоўвання, прыцягнуць увагу да курса, выклікаць зацікаўленасць. Адначасова выкладчык мае шанц правесці лекцыю з разлікам на пэўную групу студэнтаў. Выхадны кантроль дазваляе меркаваць аб эфектыўнасці заняткаў. Пытанні тут такія: аб якіх новых формах забеспячэння вольнага часу вы даведаліся з лекцыі? Якія вам больш спадабаліся? У якім мерапрыемстве вы хацелі б удзельнічаць у якасці чытача? Якую б навуковую праблему ў межах курса хацелі б даследаваць? Вашы пажаданні выкладчыку.

Найбольш дзейснымі, на наш погляд, з'яўляюцца лекцыі, якія змяшчаюць: апытанне ў пачатку заняткаў (уваходны кантроль), праблемныя пытанні з укараненнем момантаў дзелавой гульні; інфармацыю для роздуму; зварот да наглядпасці (дапаможнікі, схемы, практычныя студэнцкія работы); вылучэнне інтэлектуальнага фону у групе (памочнікаў выкладчыка); выніковае апытанне (выхадны



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ